НАША ПАМЯЦЬ

# З павагай да творцы і патрыёта

**Пабачыў свет зборнік «Водгулле вялікай вайны», у якім сабраны набыткі Мікалая Жука, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, ветэрана педагагічнай працы, паэта, аўтара шматлікіх публікацый у перыядычным друку.**

Менавіта такім яго ведаюць на Любаншчыне. А повязь з нашым краем у Мікалая Андрэевіча была моцная. Тут, у гарадскім пасёлку Урэчча, ён, ураджэнец вёскі Паўстынь Слуцкага раёна, вучыўся ў школе калгаснай моладзі. Тут і пачаў пісаць свае вершы.

Калі ж пачаліся суровыя гады ліхалецця, Мікола Жук змагаўся ў атрадзе імя Катоўскага 64-й партызанскай брыгады імя Чкалава, якая дзейнічала ў раёне вострава Зыслаў. Мужна ваяваў, але і не пераставаў складаць рыфмаваныя радкі, у якіх знаходзілі адлюстраванне народная трагедыя, партызанская барацьба супраць карнікаў, гібель блізкіх і таварышаў, боль ад страт…

Пасля вызвалення краіны ад карычневай навалы Жук пачаў настаўнічаць. З 1959-га выкладаў беларускую, рускую мову і літаратуру ва Урэцкай сярэдняй школе. Яго ўклад у выхаванне юных патрыётаў адзначаны знакам «Выдатнік народнай асветы БССР».

І хаця цудоўнага педагога і таленавітага творцы даўно няма з намі, светлыя ўспаміны пра яго жывуць у памяці тых, каму пашчасціла сустракацца з ім, вучыцца ў яго, а таксама ў вершах, паэмах, апавяданнях. З нагоды 110-годдзя з дня нараджэння Мікалая Жука і да важнай для ўсіх нас падзеі – 80-годдзя вызвалення Айчыны ад акупантаў і Вялікай Перамогі – яго дачка, доктар філалагічных навук прафесар Таццяна Дасаева, пры матэрыяльнай падтрымцы земляка Уладзіміра Бойкі падрыхтавала да выдання зборнік «Водгулле вялікай вайны».



**Мікалай ЖУК пакінуў след на любанскай зямлі.**




**Рэха ліхалецця адгукнулася ў творах пісьменніка.**

**Гэта даніна памяці і пашаны слыннаму сыну сваёй зямлі. У кніжцы змешчаны 125 вершаў і сем паэм, прысвечаных падзеям ліхалецця, па якіх можна прасачыць баявы шлях Мікалая Жука, і не толькі яго.**

Як зазначае Таццяна Дасаева, «трывожная памяць аб Вялікай Айчыннай вайне захоўвалася ў сэрцы паэта, пакуль яно не перастала біцца». І творы прасякнуты трывогай, болем за лёс Радзімы і верай у непераадольную мужнасць тых, хто змагаўся, не шкадуючы свайго жыцця.

# Доўгія вёрсты вайны

**Сёлета ўраджэнец вёскі Калінаўкі Мікалай Сямёнавіч Насановіч мог бы адзначыць стагоддзе з дня нараджэння, аднак, на вялікі жаль, ён не дажыў да гэтага ўрачыстага моманту. Тым не менш пакінуў пасля сябе светлую памяць, як чалавек працавіты, руплівы, чулы і з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй, для якога словы «мір», «Бацькаўшчына», «сумленне», «доўг» мелі асаблівае значэнне.**

Маленства Мікалая Насановіча, як і большасці яго аднагодкаў, прыйшлося на няпросты час. Таму здолеў скончыць толькі чатыры класы. І пасля Калінаўскай пачатковай школы дапамагаў бацькам па гаспадарцы і ў полі. Рана зведаў цану кавалка хлеба, прызвычаіўся да сялянскай справы і зразумеў, што без працы нельга ўявіць існавання. «Бо без яе немагчыма ствараць дабрабыт і планаваць будучыню», – разважаў вясковец. І не палохаўся ніякай работы, не пасаваў перад складанасцямі. А іх у жыцці Мікалая Сямёнавіча было нямала.

Калі яму споўнілася шаснаццаць, грозна грымнула вайна. Карнікі пачалі ўсталёўваць свой парадак, чыніць сваю чорную справу. Не мог прымірыцца з гэтым юнак. І з кожным днём усё больш мацавалася яго жаданне помсціць ворагу. Калі пачалі ствараццца партызанскія атрады ў акрузе, ён без разваг далучыўся да лясных воінаў. Адразу быў радавым у атрадзе імя М.Кутузава брыгады №25 імя Панамарэнкі. Пасля стаў разведчыкам. Давялося ўдзельнічаць у многіх аперацыях па выяўленні баявой і жывой сілы праціўніка, падрыве чыгуначнага палатна Жыткавічы – Брэст і інш. Смелы, рашучы, Мікалай ніколі не хаваўся за нечай спінай.

Пасля вызвалення тэрыторыі роднага Любанскага раёна ад карычневай чумы і злучэння партызанскіх атрадаў з Чырвонай Арміяй ён стаў стралком 93 стралковага палка.

**Можна толькі ўявіць, якімі няпростымі былі яго ваенныя вёрсты. За смеласць і мужнасць, праяўленыя ў баях за вызваленне Польшчы, наш зямляк атрымаў медаль «За адвагу».**

У жніўні 1944 года быў паранены, але варожая куля толькі зачапіла мужнага барацьбіта – траўма аказалася не вельмі сур'ёзнай. І неўзабаве ён прадоўжыў змагацца з немцамі. А ў снежні 1944-га Насановіча прызначылі камандзірам кулямётнага разліку 35 стралковага палка 96 гвардзейскай дывізіі. У саставе яго неаднаразова вызначыўся. У тым ліку падчас жорсткіх баёў пры фарсіраванні ракі Нарвы, якая адкрывала шлях у Эстонію. За гераізм і адвагу, дакладнае выкананне акрэсленай задачы Мікалай Сямёнавіч быў прадстаўлены да ордэна Славы ІІ ступені. А крыху пазней – і трэцяй, за пагашэнне вогненных кропак захопнікаў.

Як напісана ва ўзнагародным лісце, «21 сакавіка 1945 года ў баі за шашу Браўнзберг – Хайлігенбаль (Усходняя Прусія) праціўнік вёў шквальны кулямётны і аўтаматны агонь, не даваў магчымасці праціснуцца далей стралковым падраздзяленням. Сяржант Насановіч рушыў наперад баявой пяхоты і са свайго станкавага кулямёта падавіў агонь аднаго ручнога і двух станкавых кулямётаў ворага. Тым самым забяспечыў стралковым падраздзяленням пераход шашы і магчымасць заняць вёску Родау. У гэтым баі ён знішчыў каля ўзвода пяхоты».



**Кожную ўзнагароду Мікалай Насановіч прымаў з асаблівым пачуццём. А ў асабістай скарбонцы ветэрана захоўвалася шмат іх як за ратныя подзвігі, так і за руплівую працу.**

Ужо ў самым канцы ліхалецця, 7 мая 1945-га, ураджэнец Калінаўкі, які прайшоў доўгі баявы шлях, зноў быў паранены. І Дзень Перамогі ён сустрэў у шпіталі. Не выказаць словамі той радасці і гонару, што панавалі на сэрцы ў Мікалая Насановіча. Тыя адчуванні пасадзейнічалі і хутчэйшаму выздараўленню.

Дамоў Мікалай Сямёнавіч вярнуўся ў красавіку 1947 года. Цяжкасці ваеннага ліхалецця мінулі, і, як аддана радзіме, ён удзельнічаў у аднаўленні разбуранай народнай гаспадаркі. Шчыра працаваў у мясцовым саўгасе, быў брыгадзірам жывёлагадоўчай фермы, паляводчай брыгады… А потым загадчыкам па гаспадарчай частцы ў дзіцячым садку. Акрамя выканання сваіх непасрэдных абавязкаў, любіў пагаварыць з выхаванцамі. Але ніколі не хваліўся сваімі подзвігамі пра франтавое мінулае. Калі ж дзяўчынкі і хлопчыкі прасілі расказаць, гаварыў: «Ваяваў, як усе». І заўсёды паўтараў, што самае важнае, каб дзеці ніколі не зведалі такіх жахаў.

**Матэрыялы старонкі падрыхтавала Наталля ВІЛЕНТА.**